З 4 па 22 ліпеня 2019 года работнікамі аддзелаў кантролю бяспекі на чыгуначным транспарце філіялаў Транспартнай інспекцыі па Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай, Брэсцкай (уключаючы рэгіянальны аддзел у г. Баранавічы) абласцях, а таксама па г. Мінску і Мінскай вобласці праведзены маніторынг стану бяспекі транспартнай дзейнасці ў 26 арганізацыях - уладальніках чыгуначных шляхоў несупольнага карыстання, размешчаных у месцах дыслакацыі Віцебскага, Гомельскага, Магілёўскага, Брэсцкага, Баранавіцкага і Мінскага аддзяленняў Беларус кай чыгункі. У ходзе маніторынгу выяўлена 194 парушэнні, якія пагражаюць бяспетцы. Па выніках маніторынгу ў адрас арганізацый накіравана 26 рэкамендацый па ліквідацыі выяўленых парушэнняў. З 2 па 9 жніўня 2019 года праведзена 9 кантрольных мерапрыемстваў для пацверджання ліквідацыі парушэнняў, выяўленых у ходзе папярэдніх маніторынгаў стану бяспекі транспартнай дзейнасці ў арганізацыях - уладальніках чыгуначных шляхоў несупольнага карыстання. Па выніках кантрольных мерапрыемстваў адна службовая асоба прыцягнута да адміністрацыйнай адказнасці па артыкуле 18.2 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях за парушэнне правілаў бяспекі руху і эксплуатацыі чыгуначнага транспарту. З 15 па 28 жніўня 2019 года работнікамі аддзелаў кантролю бяспекі на чыгуначным транспарце філіялаў Транспартнай інспекцыі па Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай, Брэсцкай (уключаючы рэгіянальны аддзел у г. Баранавічы) абласцях, а таксама па г. Мінску і Мінскай вобласці праведзены маніторынг стану бяспекі транспартнай дзейнасці ў 22 арганізацыях - уладальніках чыгуначных шляхоў несупольнага карыстання, размешчаных у месцах дыслакацыі Віцебскага, Гомельскага, Магілёўскага, Брэсцкага, Баранавіцкага і Мінскага аддзяленняў Бе ларускай чыгункі. У ходзе маніторынгу выяўлена больш 208 парушэнняў, якія пагражаюць бяспетцы. Па выніках маніторынгу ў адрас арганізацый накіравана 22 рэкамендацыі па ліквідацыі выяўленых парушэнняў.

З 6 па 26 верасня 2019 года праведзена 15 кантрольных мерапрыемстваў для пацверджання ліквідацыі парушэнняў, выяўленых у ходзе папярэдніх маніторынгаў стану бяспекі транспартнай дзейнасці ў арганізацыях - уладальніках чыгуначных шляхоў несупольнага карыстання. Па выніках кантрольных мерапрыемстваў адна службовая асоба прыцягнута да адміністрацыйнай адказнасці па артыкуле 18.2 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях за парушэнне правілаў бяспекі руху і эксплуатацыі чыгуначнага транспарту.

У верасні 2019 года працаўнікі рэгіянальнага аддзела кантролю бяспекі на чыгуначным транспарце ў г. Баранавічы філіяла Транспартнай інспекцыі па Брэсцкай вобласці ў якасці спецыялістаў прынялі ўдзел у праводзімай Брэсцкай транспартнай пракуратурай выбарачнай праверцы выканання заканадаўства аб бяспетцы руху і эксплуатацыі чыгуначнага транспарту ў філіяле "Лунінецкая дыстанцыя шляху» УП «Баранавіцкае аддзяленне Беларускай чыгункі". У ходзе праверкі работнікамі аддзела выяўлена 54 парушэння бяспекі транспартнай дзейнасці ў галіне чыгуначнага транспарту.